Крывец, М. За баявыя дзеянні / М. Крывец // Лепельскі край. — 2006. — 28 крас. — С. 5.

**ЗА БАЯВЫЯ ДЗЕЯННІ**



Скончыўшы першы курс Мазырскага педагагічнага інстытута, Сяргей Цалуйка быў прызваны на тэрміновую службу. У 1983 годзе ў складзе 103 гвардзейскай паветрана-дэсантнай дывізіі (цяпер 103 мабільная брыгада) разам з іншымі 240 воінамі на самалёце «ІЛ-76»" быў закінуты ў сталіцу Афганістана Кабул. Так пачалася далейшая служба Сяргея, а калі дакладней, сапраўдная вайна. Дастаткова сказаць, што за паўтара гады службы больш 30 разоў прымаў удзел у баявых аперацыях. У 1984 годзе ў адным з горных раёнаў праводзіліся шырокамаштабныя баявыя дзеянні. За ўдзел у іх С. Цалуйка быў узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

– Чым даводзілася займацца на афганскай зямлі?

Я служыў у асобным батальёне сувязі. Наша задача была падтрымліваць пастаянную сувязь камандзіра дывізіі з камандуючым 40-й арміяй.

– А як склаўся далейшы лёс?

– Пасля службы закончыў Мазырскі інстытут і быў накіраваны настаўнікам у Лепель у СШ № 2. Потым давялося папрацаваць другім сакратаром Лепельскага райкама камсамола. І ўсюды адчуваў, што гэта справа не па мне. Перайшоў у органы ўнутраных спраў.

Спачатку Сяргею Фёдаравічу прапанавалі работу з асобамі, якія адбывалі пакаранне без пазбаўлення волі. Затым перавялі на аператыўную службу ў аддзел крымінальнага вышуку. З 1999 года С. Цалуйка намеснік начальніка райаддзела па кадравай і выхаваўчай рабоце, адначасова з'яўляецца старшынёй гарадской пярвічнай арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане». Не так даўно да іншых узнагарод Сяргея Фёдаравіча дабавілася яшчэ адна – медаль «Ветэрану за баявыя дзеянні».

**Мікалай КРЫВЕЦ**

**На здымку:** *узнагароду С. Цалуйку ўручае намеснік старшыні Беларускага совета воінаў-афганцаў палкоўнік В М. Сівохін*

**Фота аўтара**